Ф 27-022

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы»
_____________ І.Ф. Кітурка
_____________ 20__ г.

**КОМПЛЕКСНАЯ ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**
1-21 80 11 «Мовазнаўства»
ІІ ступені вышэйшай адукацыі
на філалагічным факультэце
ва ўстанове адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Гродна 2021

## 1. Стратэгічнае бачанне развіцця адукацыйнай праграмы

У ГрДУ імя Янкі Купалы традыцыйна вядзецца падрыхтоўка педагагічных кадраў на 2 ступені вышэйшай адукацыі адпаведна з патрабаваннямі эканомікі рэгіёна. Важнае месца тут займае гуманітарны профіль, у прыватнасці – мовазнаўства.

Як паказваюць даследаванні рынку працы, у Гродзенскім рэгіёне ёсць надзённая патрэба ў спецыялістах-філолагах, якія валодаюць кампетэнцыямі ў вобласці ажыццяўлення праектнай дзейнасці, правядзення навукова-педагагічных даследаванняў, для распрацоўкі эфектыўных метадаў рашэння задач у вобласці пабудовы аўтарскіх методык і тэхналогій адукацыйнага працэсу і іх укаранення ў педагагічную практыку; забеспячэння праграмна-інфармацыйнай падтрымкі адукацыйнага працэсу і кіраўніцкай дзейнасці.

Фарміраванне неабходных для такой дзейнасці кампетэнцый прадугледжана адукацыйным стандартам спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства».

Навучанне на II ступені вышэйшай адукацыі спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства» арганізуецца ў адпаведнасці з патрэбамі працадаўцы, на аснове прынцыпаў адкрытага ўзаемадзеяння паміж універсітэтам і спажыўцамі кадраў.

Грунтуючыся на досведзе працы выпускнікоў-магістраў кафедры беларускай філалогіі філалагічнага факультэта ва ўстановах адукацыі Гродзенскай вобласці і водгуках наймальнікаў, кафедра бачыць і гатова забяспечыць фарміраванне канкурэнтных пераваг спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства» на рынку працы.

Выпускнікі магістратуры таксама могуць папоўніць аспірантуру па спецыяльнасцях 10.02.01 «Беларуская мова»; 10.02.02 «Руская мова»; 10.02.03 «Славянскія мовы»; 10.02.19 «Тэорыя мовы» і інш.

## 2. Задачы, на рашэнне якіх накіраваны план развіцця спецыяльнасці

Кафедра беларускай філалагіі мае шматгадовы паспяховы досвед у падрыхтоўцы педагагічных і навукова-педагагічных кадраў, што палягчае рэалізацыю адукацыйнай праграмы.

Задачы па наборы абітурыентаў на II ступень вышэйшай адукацыі вырашаюцца падчас прафарыентацыйных мерапрыемстваў ва ўстановах адукацыі, прыцягненню выпускнікоў універсітэта, а таксама супрацоўнікаў розных структурных падраздзяленняў універсітэта.

На факультэце працуе дастатковая колькасць кваліфікаваных спецыялістаў, здольных на высокім узроўні забяспечваць адукацыйны працэс па спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства». Далейшае фарміраванне неабходных кампетэнцый выкладчыкаў кафедры і факультэта будзе весціся з выкарыстаннем разнастайных форм павышэння кваліфікацыі на аснове супрацоўніцтва з вядучымі ў гэтай сферы айчыннымі і замежнымі

універсітэтамі, а таксама з прадпрыемствамі-заказчыкамі кадраў.

На кафедры беларускай філалогіі ў цэлым на працягу многіх гадоў паспяхова вядзецца навуковая работа ў галіне падрыхтоўкі магістраў. Уцягванне магістрантаў спецыяльнасці «Мовазнаўства» у правядзенне сур'ёзных даследаванняў па напісанні дысертацыі дазволіць сфарміраваць даследчыя кампетэнцыі, якія дазваляюць, у далейшым, стаць суіскальнікам ступені кандыдата навук.

Магістр павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных задач прафесійнай дзейнасці:

- падрыхтоўка і правядзенне заняткаў з навучэнцамі, кіраўніцтва іх навукова-даследчай работай, распрацоўка вучэбна-метадычнага забеспячэння;
- выкарыстанне дасягненняў навукі і перадавых тэхналогій у галіне навуковых і адукацыйных працэсаў;
- распрацоўка практычных рэкамендацый па выкарыстанні навуковых даследаванняў;
- распрацоўка планаў і праграм арганізацыі інавацыйнай дзейнасці, абгрунтаванне інавацыйных праектаў у прафесійнай дзейнасці.

У сілу спецыфікі спецыяльнасці і з улікам наяўнага на кафедры задзелу праграма змяшчае пералік мерапрыемстваў па развіццю навукова-метадычнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыйнага працэсу і даследчай дзейнасці магістрантаў і выкладчыкаў.

## 3. Пералік мерапрыемстваў па развіццю спецыяльнасці

### 3.1. Навучальны працэс.

3.1.1. Важным фактарам паспяховай рэалізацыі адукацыйнай праграмы з'яўляецца фарміраванне добра падрыхтаванага ў галіне педагогікі тэарэтычна, метадалагічна і метадычна, а таксама матываванага да глыбокага засваення праграмнага матэрыялу кантынгенту магістрантаў. Факультэт выкарыстоўвае мноства формаў і метадаў прафарыентацыйнай працы. Асноўныя мерапрыемствы, накіраваныя на прыцягненне абітурыентаў на спецыяльнасць "Мовазнаўства", прадстаўлены ў табліцы 3.1.

Табліца 3.1. Пералік мерапрыемстваў у галіне прафарыентацыйнай і маркетынгавай дзейнасці

| № | Назва мерапрыемства | Тэмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Правядзенне статыстычнага аналізу баз дадзеных абітурыентаў, якія збіраюцца паступаць у магістартуру | На працягу года | Выкладчыкі кафедр, кіраўнікі дыпломных | Не патрабуюцца |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | прац | |
| 2. | Праца з кіраўнікамі метадычных аб'яднанняў школ, раёнаў з мэтай інфармавання аб паступленні ў магістратуру | На працягу года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Не патрабуецца |
| 3. | Наладжванне кантактаў са школамі, ліцэямі, каледжамі з мэтай інфармавання аб перспектывах вучобы ў магістратуры | На працягу года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 4. | Размяшчэнне інфармацыі на сайце факультэта і пастаяннае яе абнаўленне аб умовах навучання ў магістратуры і перспектывах пасля яе заканчэння | На працягу года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 5. | Правядзенне кансультацый з патэнцыйна магчымымі магістрантамі | На працягу года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 6. | Распрацоўка і выданне рэкламна-інфармацыйных выданняў пра спецыяльнасць "Мовазнаўства" | На працягу года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 7. | Правядзенне кансультацый па вучэбным прадмеце "Агульнае мовазнаўства" з мэтай падрыхтоўкі для паступлення ў магістратуру | Май-чэрвень кожнага года | Заг. кафеды і выкладчыкі | Аўдыторыі, тэхнічныя сродкі навучання |

3.1.2. Дысцыпліны навучальнага плана спецыяльнасці забяспечаны вучэбнапраграмнай дакументацыяй і вучэбна-метадычнымі матэрыяламі. Распрацаваныя раней для іншых спецыяльнасцей ЭУМК патрабуюць нязначнай дапрацоўкі.

Асноўная задача – стварэнне новых ЭУМК па дысцыплінах, якія адсутнічаюць у навучальным плане іншых спецыяльнасцей, замацаваных за кафедрай беларускай філалогіі. План мадэрнізацыі і распрацоўкі ЭУМК прадстаўлены ў табліцы 3.2.

Табліца 3.2. План распрацоўкі электронных навучальна-метадычных комплексаў.

| № | Назва дысцыпліны | Тэрмін выканання | Адказны |
|---|---|---|---|
| 1. | Метадалогія лінгвістычных даследаванняў | 2023 | Сінлівеня Ж.С., кандыдат |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | філалагічных навук, дацэнт |
| 2. | Спецыяльны семінар па профілю дысертацыі | 2023 | Сіплівеня Ж.С., кандыдат філалагічных навук, дацэнт |
| 3. | Семіётыка і філасофія мовы | 2024 | Варановіч В.Л., кандыдат філалагічных навук, дацэнт |
| 4. | Тэхналогія крэатыўнай адукацыі ў вышэйшай школе | 2024 | Брусевіч А.А., кандыдат філалагічных навук, дацэнт |
| 5. | Афарыстычнасць мастацкага тэксту | 2025 | Аляшкевіч Т.А., кандыдат філалагічных навук, дацэнт |

3.1.3. Асновай выкладання спецыяльных дысцыплін у магістратуры з'яўляецца рэалізацыя прынцыпу практыкаарыентаванасці ў падрыхтоўцы высокакваліфікаванага спецыяліста.

З мэтай павышэння якасці навучальнага працэсу, а таксама рэалізацыі сусветных тэндэнцый у сферы вышэйшай адукацыі на кафедры беларускай філалогіі ў цяперашні час выкарыстоўваюцца інавацыйныя практыка-арыентаваныя формы і метады выкладання: метад праектаў, кейсаў і інш.

Табліца 3.3. План мерапрыемстваў па забеспячэнні якасці навучальнага працэсу і укараненню інавацыйных тэхналогій выкладання.

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выкананн я | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Кіруючыся маніторынгам задаволенасці спажыўцоў, ажыццяўляць карэкціроўку вучэбнай дакументацыі адукацыйнай праграмы | пастаянна | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 2. | Абмеркаванне выніковасці рэалізацыі дадзенай адукацыйнай праграмы на пасяджэннях кафедры | 1 раз у год | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 3. | Замацаванне навуковых кіраўнікоў з прафесарска-выкладчыцкага складу | На працягу года | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | кафедры за таленавітымі студэнтамі, якія збіраюцца паступаць у магістратуру | | | |
| 4. | Распрацоўка і ўдасканаленне тэхналогіі дыстанцыйнага навучання пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу | На працягу года | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Матэрыяльна-тэхнічныя, інфармацыйныя, кадравыя |
| 5. | Выкарыстанне ў навучальным працэсе інавацыйнай структуры ўніверсітэта | 2023-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 6. | Забяспячэнне ўмоў для выкарыстання падчас вучобы ў магістратуры індывідуальнага графіка навучання. | пастаянна | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 7. | Выкананне магістарскіх дысертацый па заяўках арганізацый-заказчыкаў з магчымым працаўладкаваннем магістраў у дадзеную арганізацыю | пастаянна | Загадчык кафедры, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце | Не патрабуюцца |
| 8. | Удасканаленне фонда ацэначных сродкаў па вучэбных дысцыплінах | пастаянна | Загадчык кафедры, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце | Матэрыяльна-тэхнічныя, інфармацыйныя, кадравыя |
| 9. | Забяспячэнне электроннымі вучэбна-метадычнымі комплексамі, якія атрымалі дзяржаўную рэгістрацыю | пастаянна | Загадчык кафедры, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце | Матэрыяльна-тэхнічныя, інфармацыйныя, кадравыя |

**3.2. Кадравы патэнцыял**

Важным напрамкам кадравай работы з'яўляецца падрыхтоўка і абарона кандыдацкіх дысертацый супрацоўнікамі факультэта, якія скончылі аспірантуру, накіраванне маладых выкладчыкаў для навучання ў аспірантуры і павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў шляхам праходжання профільных курсаў у вобласці педагагічных інавацый і інфармацыйных тэхналогій, а таксама стажыровак у вядучых профільных універсітэтах у краіне і за мяжой,

у арганізацыяхзаказчыках кадраў.

Табліца 3.4. Пералік мерапрыемстваў па развіццю кадравага патэнцыялу

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніцы фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Стажыроўка па профілі выкладаемых курсаў ва УВА РБ (БДУ, БДПУ імя М. Танка і інш.) | Згодна з графікам | Загадчык кафедры | Бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі ГрДУ |
| 2 | Забяспечыць падрыхтоўку і абарону кандыдацкай дысертацыі Тарасавай С.М. | 2023 | Загадчык кафедры | Не партабуюцца |
| 3 | Забяспечыць падрыхтоўку і абарону доктарскіх дысертацый Брусевіча А.А., Шандрохі Н.Э. | 2025 | Загадчык кафедры | Не партабуюцца |

3.3. Навукова-даследчая і інавацыйная дзейнасць

Уцягванне магістрантаў спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства» у вучэбна-даследчую, навукова-метадычную і навуковую працу з'яўляецца адной з асноўных задач выпускаючай кафедры.

3.3.1. На кафедры выконваецца навукова-даследчая работа у межах тэмы навуковага даследавання «Лексіка і фразеалогія беларускай мовы ў сінхранічным, дыяхранічным і супастаўляльна-дыяхранічным аспектах». Навучэнцы магістарская праграмы 1-21 80 11 «Мовазнаўства» прымаюць удзел у выкананні дадзенай НДР праз удзел у навуковых канферэнцыях і навуковых публікацыях у адпаведных выданнях.

3.3.2. Для выканання НДР, у тым ліку па заяўках прадпрыемстваў і арганізацый, ажыццяўляецца інфармаванне прадстаўнікоў і іншых арганізацый аб навуковых распрацоўках, наяўных у прадстаўнікоў факультэта. Інфармаванне ажыццяўляецца рознымі спосабамі:

- прадстаўнікі іншых вышэйшых навучальных устаноў запрашаюцца ў якасці членаў Дзяржаўнай камісіі па абароне магістарскай дысертацыі;
- навуковыя распрацоўкі прадстаўляюцца ў рамках конкурсаў і іншых мерапрыемстваў, якія штогод праходзяць як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў іншых краінах;
- праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі навучальных устаноў і іншых арганізацый;

Для ўключэння студэнтаў у НДРС, праектную дзейнасць, стартап-рух неабходна пераканаць студэнта ў тым, што веды і ўменні, атрыманыя імі пры навучанні на факультэце, дазваляюць не толькі ўдзельнічаць у розных

мерапрыемствах, але станавіцца ў іх прызёрамі і пераможцамі. Такім чынам, павелічэнне колькасці прызёраў розных конкурсаў і шырокае інфармаванне аб магчымасці ўдзелу студэнтаў факультэта ў гэтых конкурсах павінна прывесці да павелічэння колькасці студэнтаў, якія прымаюць удзел у НДРС, стартап-праектах і іншых мерапрыемствах падобнай накіраванасці. Пералік мерапрыемстваў па развіццю НДіІД прадстаўлены ў табліцы 3.5.

**Табліца 3.5. Пералік мерапрыемстваў па развіцці навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці**

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Забяспечыць удзел у НДПС не менш 80% магістрантаў першага і другога года навучання | 2021-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 2. | Забяспечыць публікацыйную актыўнасць магістрантаў (не менш 2-х публікацый у год) | Пастаянна | Кіраўнікі магістарскіх прац | Не патрабуецца |
| 3. | Садзейнічаць ажыццяўленню 100% самастойнага даследавання па тэме магістарскай дысертацыі | Пастаянна | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 4. | Павелічэнне індэкса цытуемасці ПВС | Пастаянна | Загадчык кафедры | Не патрабуецца |
| 5. | Павелічэнне долі ПВС, якія ўцягнуты ў выкананне фінансуемых тэм | Пастаянна | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 6. | Прыцягненне магістрантаў у НДПС, праектную дзейнасць, стартап- рух | Пастаянна | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Не патрабуецца |
| 7. | Забеспячэнне выступленняў з дакладамі на канферэнцыях, круглых сталах усіх магістрантаў | Пастаянна | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Не патрабуецца |

3.4. Супрацоўніцтва, у т. л. міжнароднае

3.4.1. У цяперашні час факультэт мае партнёрскія адносіны ў галіне ўкаранення інавацый і тэхналогій, аформленыя дамовамі з арганізацыямі, пералік якіх прыведзены ў табліцы.

**3.6. Табліца. Партнёры (наяўныя).**

| № | Назва арганізацыі | Напрамак супрацоўніцтва |
|---|---|---|
| 1. | Дзяржаўны літаратурны музей імя Янкі Купалы | Правядзенне сумесных навуковых і выхаваўчых мерапрыемстваў |
| 2. | Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава | Супрацоўніцтва ў рамках праграмы “Запрошаны прафесар”, ажыццяўленне сумесных публікацый. |
| 3. | Варшаўскі ўніверсітэт, кафедра беларусістыкі | Супрацоўніцтва ў навуковай і вучэбнай згодна з дамовай, падпісанай у 2019 годзе. |
| 4. | Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі | Правядзенне сумесных выхаваўчых мерапрыемстваў |
| 5. | ДУА СШ № 32 г. Гродна | Павышэнне кваліфікацыі, праходжанне практыкі, прафарыентацыйная дзейнасць, удзел у ДзЭК, выкананне тэм магістарскіх дысератый па заяўцы школы. |
| 6. | ДУА СШ № 6 г. Гродна | Павышэнне кваліфікацыі, праходжанне практыкі, прафарыентацыйная дзейнасць, удзел у ДзЭК, выкананне тэм магістарскіх дысератый па заяўцы школы |

3.4.2. Факультэтам ужо заключаны дамовы з арганізацыямі, пазначанымі аб супрацоўніцтве з арганізацыямі, прыведзенымі ў табліцы 3.4.1

Развіццё супрацоўніцтва з арганізацыямі па профілю спецыяльнасці 1-21 80 11 «Мовазнаўства» плануецца шляхам правядзення мерапрыемстваў, асноўныя з якіх прыведзеных у табліцы 3.8.

**Табліца 3.8. Пералік асноўных мерапрыемстваў па развіццю супрацоўніцтва.**

| № | Назва мерапрыемства (з указаннем арганізацыі-партнёра) | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Правядзенне практычных і лабараторных заняткаў на | Пастаянна | Загадчык кафедры | Тэхнічныя сродкі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | базе арганізацыі | | | навучання |
| 2. | Узаемадзеянне з прадстаўнікамі заказчыкам кадраў у рамках працы Каардынацыйнага савета філалагічнага факультэта | Пастаянна | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 3. | Удзел прадстаўнікоў установ адукацыі ў ДзЭК | Красавік кожнага года | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 4. | Арганізацыя круглых сталоў з прадстаўнікамі партнёрскіх арганізацый па пытаннях павышэння якасці навучальнага працэсу, рэалізацыі практыка-арыентаванага навучання, канцэпцыі студэнтацэнтрыраванага навучання | На працягу года | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 5. | Правядзенне кансультацый для магістартаў прафесарам МДУ імя М.В. Ламаносава, доктарам філалагічных навук Шэшкен А.Г. | Кастрычнік, 2022 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |

### 1.5. Інфраструктура і матэрыяльна-тэхнічная база

Факультэт размяшчаецца ў корпусе па вул. Леніна, 32. У корпусе ёсць лекцыйныя памяшканні, у якіх размешчана стацыянарнае мультымедыйнае абсталяванне (аўд. 5, 9).

Стан матэрыяльнай базы кафедры не зусім спрыяе высокаэфектыўнаму ажыццяўленню адукацыйнай і навукова-даследчай работы. Адсутнічае прасторавая магчымасць для ўстаноўленага нарматыўнымі дакументамі доўгатэрміновага захоўвання справаводства, вучэбнай і вучэбна-метадычнай дакументацыі і вынікаў дзейнасці навучэнцаў (курсавых, дыпломных работ, справаздачнай дакументацыі па практыцы, лістоў адказаў, кантрольных работ і інш.).

Для ўдасканалення адукацыйнай і навуковай дзейнасці неабходна ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы кафедры і факультэта ў цэлым, і патрабуецца дадатковае абсталяванне лекцыйных аўдыторый стацыянарнай кампутарнай тэхнікай і мультымедыйным абсталяваннем, сучаснай модульнай мэбляй, якія ў сукупнасці дазволяць ствараць мабільную прастору для вырашэння канкрэтных задач.

**4. Ацэнка рызык пры рэалізацыі плана развіцця спецыяльнасці**

Крытычны аналіз пазіцый спецыяльнасці “Мавазнаўства” у кантэскце функцыянавання ГрДУ ім. Я Купалы і сістэмы вышэйшай адукацыі РБ у цэлым дазваляе вызначыць існуючыя рызыкі і праблемыя зоны ў рэалізацыі дадзенай праграмы

| № | Назва магчымых рызыкаў | Мерапрыемствы па ліквідацыі рызык |
|---|---|---|
| 1. | Узмацненне канкурэнтнай барацьбы на рынку адукацыйных паслуг | Вывучэнне рынку попыту на адукацыйныя паслугі, прафарыентацыйныя мерапрыемствы |
| 2. | Адсутнасць матывацыі ў выпускнікоў універсітэта працягваць навучанне на II ступені вышэйшай адукацыі | Прафарыентацыйныя мерапрыемствы, маркетынгавая дзейнасць |
| 3. | Эпідэміялагічная абстаноўка ў краіне і свеце, звязаная з пандэміяй каронавіруснай інфекцыі | Акцэнт ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе кафедры на тэхналагічныя і лічбавыя рэсурсы |
| 4. | Змена попыту і прапаноў на рынку навуковых паслуг | Вывучэнне рынку і попыту адукацыйных паслуг, маркетынгавая дзейнасць |

Прарэктар па вучэбнай рабоце

______________________ Ю.Э.Бялых

Дэкан філалагічнага факультэта

______________________ С.В. Ганчар

Заг. кафедры беларускай філалогіі

____________ А.С. Садоўская

Рэкамендавана да зацвярджэння

Саветам філалагічнага факультэта
Пратакол № 9 ад 19.11 2021 г.

Кафедра беларускай філалогіі
Пратакол № 9 ад 09.11 2021 г.